ў імя Хрыста прапаведуюць яны здраднiцтво народу.

Запраўды кажу вам: яны—прадвешчэные Хрыстом фальшывые прарокі.

I з нашых колішніх баяр, што даўно праменялі національную сваю душу, і с цяперэшніх новенькіх „пэркалёвенькіх", каторых бацькі або ешчэ жывуць збожна пад селянскай стрэхай, або ешчэ не згнілі у магілі.

Як чэрві поўзаюць яны у народзе нашым і шырацъ заразу здрадніцтва, атступніцтва ды вытыкаюць і аплёвываюць кожнаго, хто паважыўся пайсьці простай дарогай да народу, прыбліжыўся да гэтаго пакінутаго ўсімі, Лазара і адважыўся змачыць вадой засмягшые яго вусны і заскарузлые вочы.

Так, народ наш—Лазар-пакутнік, бедны, цёмны, сьляпы.

Хто-ж падойдзе да яго, хто агледзіць яму раны, калі ня будзе ён мець спагаднікоў са сваей сямьі?

Чужынцы? Але-ж братняя, з брат-дзеці, апека давяла яго да такога палажэньня ў якім ён цяпер знаходзіцца

Да вас, хто мае сэрцэ, слова маё: прамывайця вочы братом і нясіця помач пакінутаму і аплёваваму Лазару ня толькі словам але чынам-дзелам. Працуйця над узбагачэньнем убогаго, бараніця ад крыўды і здзеку ды будзьця самі як скалы цьвёрды, каторые умеюць устаяць і проці напору паводкі, і проці сілы ветру.

**Юры Верэшчака.**

## Аб вясковай інтэлігэнціі.

Па нашых вёсках і мястэчках, пасярод шэрай хлебаробскай массы, шмат жыве вясковай інтэлігенціі: народных вучыцелёў, фэльчароў, пісароў у уселякіх канцэлярыях і інш.

Як вядома—гэта найболей беларусы с крыві і косьці, селенскіе дзеці, каторым пашэнціло або акончыць спэціальные школы (фэльчэрскіе школы, вучыцельскіе сэмінарыі), або проста навучыцца сяк так граматы ды дзе небудзь прыстроіцца. Плату яны атрымліваюць, найболей, надта малую; з грашамі, як не круці, як не беражы каб на ўсё меней выдаць, пастаянная выходзіць неўпраўка. Значыцца горэ і бедната з якой яны пазнаёміліся гадуючыся у бацькоўскай хаці, не пакідае іх і посьле, ды праз ўсё жыцьцё гняце.

Але ўсё ж такі жывуць яны лепей ад селян, працуюць не рукамі, а галавой, свабоднаго часу маюць шмат болей, і зусім натуральна было-бы каб яны шмат чыталі і усім цікавіліся, ды шырылі асьвету сярод сермяжных братоў, служылі бы цэнтрамі, каля каторых групаваліся-б усе болей культурные і сьвядомые сілы вёскі.

Гэтак яно магло-б быць і павінна быць, але не заўсёды гэтак ёсць.

Пісарчукі, праўда, меней ад другіх зарабляюць, але і культурная вышыня паміж імі шмат ніжэйшая. Людзей удумчывых, развітых душой, людзей каторые-бы пачувалі на сабе якую небудзь павіннасць, апрача скарынкі хлеба на свой жывот, працаваць ешчэ і для народу, тутака дужа мала. Перэмагаюць людцы, каторые з вялікай пагардай глядзяць на той народ з якога яны вышлі, чураюцца роднай мовы сваей і, хоць часта дужа дрэнна, гавораць па „панску", адным словам „паркалёвые" людцы з ідэолёгіей: карты, гарэлка, распуста, адным словам бруд жыцьця.

Шмат культурней народные вучыцелі і фэльчэры. Паміж імі куды болей людзей каторые добра разумеюць сваю грамадзянскую павіннасць ды колькі мага яе выпаўняючых; людзей, каторые сочуць за поступам і развіцьцем думкі культурнаго чэлавечэства. Але ўсё ж такі і тут гэткіх людзей ня помнога, і толькі невялічкая частка вясковых інтэлігентоў робіць усё што трэба. Затое шмат людзей і тутака, — далей цыркуляроў начальства—сьвету Божаго не бачуць. Усю грамадзянскую мудрасць яны чэрпаюць с чорнасоценных газэт, на таварышоў, што думаюць іначэй, гэтые людцы гатовы і брэхлівы данос напісаць. Але тут гэткіе людцы большасць не састаўляюць. Большасць вучыцелёў і фэльчэроў чытае якую небудзь шаблонную лібэральную газэтку, — часта прачытае паважную, сумленна апрацаваную кніжку, ці твор краснаго пісьменства, але агулам чытае помала; у акружаючым іх разбіраюцца не надта добра; акром таго, што вымагае служба, не вядзе ніякай культурнай працы у народзі, хоць на славах прызнае вялікую яе патрэбу.

Жывуць гэтые ягомасьці сярод гаротнаго народу, самі з яго вышлі, самі шмат гаруюць і тым болей павінны былі-бы адчуваць супольнасць з ім, але неяк с простымі, беднымі селянамі зусім мала яны сябруюць Трымаюцца або толькі самі с сабой, або вядуць кампанію з людзьмі багацейшымі у каторых свабодную часіну запаўняюць карты, гарэлка, плёткі ды інш. У такой кампаніі паважные рэчы ня ў модзе, разумнай гаворкі не пачуеш. Тым болей сумна, што сярод праводзячых гэтак час пападаюцца і людзі разумные, каторые шырэй глядзяць на сьвет.

Тымчасам колькі дабра могбы зрабіць інтэлігентны працаўнік! Шмат дзе па вёсках ёсць, такіе ж бедные, як усе селяне, але людзі разумнейшые ад другіх, болей удумчывые, развітые і каторые хочуць ешчэ чаго даведацца. Гэткіе людзі ахвотна чытаюць, а іншые гэтак ачытаны і развіты і энэргічны, што самі шырацъ асьвету; але куды болей такіх, каторым патрэба крапчэйшых сяброў, каторые бы патрапілі падтрымаць іх энэргію і лепшые парывы. Калі гэтаго німа, то яны апускаюцца,—культурные патрэбы памалу счэзаюць і хутка яны ужо нічым ня розняцца ад звычайных шэрых селян.

Вось, вясковые інтэлігенты перш наперш павінны згрупаваць каля сябе гэткіх людзей, завадзіць з імі сур'ёзные гутаркі, заахвочываць да чытаньня добрых кніг і газэт, агулам не даваць заглохнуць іхнім культурным патрэбам. Трэба парупіцца, каб гэткіх людзей рабілося усё болей ды болей, каб з іх памалу шырылася асьвета і ў цёмнай массе. Трэба дбаць, каб там дзе варункі падходзяць, да гэтаго, закладаліся уселякіе хаўрусы і гурткі, каб народ прывучаўся лепей гаспадараваць на зямлі.

Але ешчэ большае значэньне мае рост грамадзянскай і національнай сьведомасці; куды важней ад матэрьяльнай карысьці,—якую дасць добра развіваючыйся хаўрус, або новы спосаб гаспадаркі,—тое, што с поступам асьветы усё болей і болей крытычна у усім разбірацца будзе народ,—што асвабодзіцца ён, дзеля гэтаго, с пад ўлады уселякіх забабоноў і страхоў і лепшую долю сабе дабудзе.

**Лявон Гмырак.**

## Соннэт.

Прынадна вочы зьяюць да мяне;
Чароўна усьміхаючыся, губы
Аткрылі буйные, бялеючые зубы...
Ласкавы шэпт... Гарачай хваляй мкне

Кроў к сэрцу маему. Мана ўсё, або не?
Ці верыць мілым абецанкам любы?
Мо гэта жар, пылаючы для згубы,
Хавае сьцюжу пад сабой на дне.

Так, іншы раз, над соннаю зямлёю
Агністаю дугою залатою
Прарэжэ цемень яркі мэтэор.

Гарыць ён, іскры сыпе і нясецца
Блішкаючы мацней ад ясных зор,—
А ў глыбіне халодным астаецца.

**Максім Богдановіч.**

## Дзіцяці.

—о—

Ты шчасліва, дзіця дарагое,
Тваё сэрцэ нічым не баліць,
Непрыкметна так дзецтво святое
Тваё роўна і шчасна бяжыць,

Ты не знаеш сэрцовай трывогі,
Думкі роем душы не муцяць;
Прад табой жыцявые дарогі
Усе усыпаны ў кветкі лежаць.

Так жывіж-ж ты з яснай душою
І цярпення, жыцьця мук не знай,
Бо прамчацца дзянькі чарадою,
Гэты ясные дні—жыцьцё-рай!

І надойдуць тады ўсе нягоды,
Што пачас ты й жыцьцё праклянеш,—
Тады ўспомніш дзіцячые годы,
І душою у іх аддыхнеш...

**М. Арол.**

— Ну, а як брэшэ Гаронімаў Лыска?—Пыталі Пятруся

Пятрусь брэхаў. І ніхто не падумаў бы, што гэта брэшэ Пятрусь, а не Гаронімаў Лыска.

Тамаш слухаў, і губы яго самі разнімаліся для сьмеху

— І крлошкі пабраў,—сказаў, гаркаючы Тамаш.

— Пятрусь!—ня вытрываў Тамаш:—а як блрат мая сучка брлэшэ?

Жулік—Пятрусь зірнуў на Тамаша,

— Гэрл! гэрл! гэрл! — перэдражніў ён Тамаша і яго сучку.

Усе так і паехалі са сьмеху.

— От брладзяга! — сказаў Тамаш і плюнуў. Тамаш пасядзеў ешчэ колькі мінуцін; гаворка начлежнікоў, іх крык і шум нейк адлеталі ад яго і не трывожылі; потым ён прылёг, падпёршы рукою голаву. Сон непрыкметна самкнуў яму вочы, рука аслабела, і галава сама з'ехалася на распрастаную руку.

III.

— Пан Бог з намі, Дух Святы! што са мною? дзе я?

Тамаш ўзьняў галаву і стаў прыгледацца. Ён чуў, што нешта цяжкое наваліся ня яго плечы, і павярнуўся. Гэтае мяккое і цяжкое бяз шуму спаўзло з яго Яму было холадна, ўсе члонкі яго цела дрыжэлі ад ранічнай сырасьці. Тамаш успомніў, што тут павінен быць агонь. Але дзе ж начлежнікі. Ні агню ні начлежнікоў не было і почуту.

— Што за праява? — Тамаш правёў рукою па твары, працёр вочы. Змрок і туман, прадвесьнікі раніцы, густа віселі над зямлёю і ўсё закрывалі ад вачэй. Ўсюды было ціха. Тамаш стаў прыпамінаць мейсцэ, куды прыехалі на члежнікі, прыпомніў вечэр жарты начлежнікоў, Пятруся—брэхуна. Не без пачуцьця крыўды ўспомніў ён гэтаго самаго шэльму, каторы састроіў кпіны з яго, паказаўшы, як брэшэ яго сучка. А што было далей? Ці то яму сьнілося, ці гаварыў хто з начлежнікоў,—тут Тамаш увесь закалаціўся! І вот што цяпер яму ўспомнілося. Было гэта на начлезі. У адным мейсьцы тварылося штось страшнае і неўцешнае. Нейкая сіла (ведама, нячыстая), не давала людзям спаць на гэтым мейсцы. Сідзяць, гаворуць—нічога. А як чуць толькі задрэмлеш, зараз жэ с пад цябе ляціць к чортавай матары вобрудзь, шапка, люлька, нават халат здзярэ і закіне так, што ня скора і знайдзеш. Ці не стаўся і ён, Тамаш, ахвярай чортавай сілы?

Тамаш перэхрысьціўся — так яму стала страшна—рука яго кранулася чагось мяккаго і сырога; аглянуўся—купіна; яна нібы заварушылася, і на ёй на момэнт блеснуў агоньчык. Шапка ўзнялася, валасы паўставалі на галаве Тамаша, і ён усхапіўся і пусьціўся наўцекі. Але не прабег Тамаш і дзесяць крокоў, як уляцеў у нейкую багну. Тамаш крута павярнуў назад. Лапаць заеўся ў гразь, і нага вылузалася з яго. Бегучы назад Тамаш спатыкнуўся на купіну і паваліўся. Тут яго апанавала такая дзікая злосць, што ён пачаў таптаць і мясіць нагамі купіну с такою сілаю, што купіна зраўнялася з долам і толькі чорная пляма асталася сьледам ад гэтай паганкі. Тамаш чуў, што пад нагамі як бы нешта пісънуло, але гэта толькі паддавала злосьці. І Тамаш ешчэ доўга, як ашалелы, скакаў па чорной плямі, падгуківаючы

— Ву! ву! ву!

Зніштожыўшы ў канец купіну, Тамаш скруціў дзьве фігі і сунуў іх у розные канцы свету

— Вот вам, Брладзягі!

У Тамаша знайшлася такая ахвота пакрышыць рэбры ешчэ якому—небудзь чорту, што ён, здавалося, і нерад быў, што на ўсходзі пачынало святлець і што заміж чорта звонка паняслося па лузі

І-і—га-га га!

Конскае іржаньне прывяло Тамаша да памяці, і ён пашоў у той бок, дзе былі коні. Прайшоўшы колькі вератнёў, Тамаш насунуўся на начлежнікоў. Скорчыўшыся у тры пагібелі спалі яны вакруг таго мейсца, дзе быў агонь, а на самым вогнішчы, закрыўшы яго жыватом, лежаў Панас, пярвейшы штукар ва ўсім сяле. Нідалёка хадзілі і коні. Узяўшы вобрудзь і нікому не сказаўшы і слова, Тамаш пашоў браць каня. Тамаш прыглядаўся шукаючы каня с пярэвяслам на шыі. А, вот ён! Тамаш працяг руку, каб узяць каня за грыву. Конь, ухмыліўшы вушы, павярнуўся задам і намерыўся убрыкнуць Тамаша. Тут толькі разгледзіў ён наравістую кабылу Андрэя Мотуза. Тамашу стала ясна ўсё. Сярдзіта глянуў ён у бок начлежнікоў. Адтуль нёсся прыдушэны рогат Панаса.

— А каб ты у чыстым полі рагатаў, каб цябе вон нагамі вынеслі, як ты мяне нёс, каб на тваю шыю вяроўку завязалі, як завязаў ты перэвясло, гіцлю!

**Тарас Гушча**

* * *

Я не раз ў дрэнны час
Думаю—гадаю...
А над чым і за чым?
— Долі я не маю!

Прыкра мне, бы ў турме,
Час жыцьця бяз долі,
І што дзень думак цень
Цісьне дух да болі.

Час бяжыць і ляціць
Быстраю стралою,
А нуда і беда
Не даюць спакою.

А. Гурло.

# З Беларусі і Літвы.

## З Віленшчыны.

**У нядзелю 26 студня Беларуская вечарынка У Залі „Сокол“ (Віленская № 10).**

### Выстаўка насеньня.

Віленскае і ковенскае Сельск. Гасп. Таварыства сёлета, як і летась арганізуюць выстаўку насеньня. Выстаўка адбудзецца у Вільні на першым тыдні вялікаго посту (17—23 лютаго). Апрача паказу—на выстаўцы будзе і прадажа рознаго насеньня,

## З Міншчыны.

**В. Старыца.** (Слуцкаго павету).

У сярэдзіне сьнежня быў пажар. Згарэло 2 гумны. Здарылося нешчасьця ад неасьцярогі. Селяне, колькі змога, памагаюць бедаком. Калі не лічыць, што гадоў 13 назад згарэла цэрква, старые людзі кажуць, што больш за 125 гадоў не было пажару.

Каля села цячэ рэчачка. З аднэй страны селянская земля, з другой—панская. У гэту рэчку і выліваюць увесь бруд з бровара. Саўсім запаганілі, нельга падыйсьці да яе, ня толькі, каб напіцца вады. Есць у сяле санітарны дазорчы, але гэта яго, мусі, не датычэ. Маўчаць і селяне: баяцца угнявіць, бо не дадуць сенажаці. Людзі надта мяккіе, німа пачуцьця свайго гонару. Ен ёсць, ды толькі у сваей хаці. Мусі каб паны сказалі па сваім дварэ ні хадзіць, споўнілі-б Моладзь крыху менш гне карк, але панскае слова — закон. Надта сьцерагуцца угнявіць дворных паноў. Але у гэтым гаду, дзякуючы вялікім дажджом, не захацелі узяць сенакосу на 7-ю капу. Канюшына зрадзіла добрая, абышліся і без панскай ласкі. Потым аддаваў ужо і тан ней, не ўзялі. Восеньню папрабаваў сам касіць, плаціў касцом па 50 кап.. даваў харчы, гарэлку— скасіў тольлі дзесяцін 3 ды і тое згніло. Падаражыўся, вазоў 500 сена прапала.

Дагэтуль ціха было у нашым сяле. Ніхто нікога не пакрыўдзіў. Праўда вадзіліся 2 браты іншы раз за чубы, і то гадоў за 10 назад. Людзі любяць навуку, дзеткі ахвотна бегаюць у школку, неграматных 2—3 дзяды ды старые жанкі. Моладзь праводзіць час надта хораша Зробяць вечарынку, цэлу ноч танцуюць пяюць песьні. Танцы і сьпевы чужые, але нічога ні парадзіш. Добра, што хаця ціха. У астатні час стала чуваць, што хлопцы сталі у кішэні насіць малаткі, сякеркі, кускі жалеза. Гаварылі, ды ўсё ня верылося, наастатку даў веры. На Новы Год сабраліся хлопцы і дзеўчаты. Дзеля сьвята былі падвыпіўшы. Зайшлі да іх два мужчыны браты— Тодар і Васіль Маладзякі. Пачалася лаянка, Тодар пабіў вакно, а Васіль стаў кідацца з нажом да гаспадыні дзяўчыны. Хлопцы узяліся за дзеўчат, патушылі агонь і добра наклеілі ім. Вураднік рабіў дазнаньне. Мала таго, што памацавалі галавы, але ешчэ пацягнуць у суд за нарушэньня цішыны. Усе дзеўчаты паказалі, што глаўны вінаваты Тодар. Як вышоў увесь хмель з галавы, ён надта спужаўся і хочэ паміріцца. Німа чаго гаварыць, адлічыліся Старычане, добра правялі першы дзень Новаго Году.

З восені прыслалі да нас другога вучыцеля. Хлопец тутэйшы, носа не драў, вучыў добра. Ня ведаю добра (баюць многа), з якое прычыны не спадабаўся ён пану. Пасварыліся, ды пан пастараўся, каб яго перэвялі. С 1-го студня паехаў вучыцель у Талядавічы, а у нас, пакуль што дзеткі гуляюць. Мусі і да восені ня будзе другога, бо у Слуцкім павеці, казалі, пустуюць 5 вучылішч: нідахват вучыцелёў. *Зрэбны.*

## З Вітэбшчыны.

### С над Вітэбска.

Люд наш, у гэтай мейсцовасці дзе я жыву (ад Вітэбска вёрст 70) цёмны, малаграматны; праўда, школ расейскіх каля нас ёсць многа, але там дзяцей ня вучаць па беларуску і яны кончыўшы школу не развіваюцца ні душой ні розумам а толькі навучаюцца мэханікі чытаньня ды у сваю мову уносюць многа чужых слоў і крыўляюць яе Шкада вялікая што нашы вучыцельніцы і вучыцелькі ня хочуць выпісываць „Н Н.“, хоць кругом яны тут беларусы блізка што усе. Прачытаць па беларуску добра ня толькі вучні, але часта і вучыцялі ня ўмеюць. Мне прыхадзілося з некаторымі вучыцелямі гаварыць аб гэтым, дык ажно сэрцэ баліць слухаць як яны кажуць:—усё роўна расейская мова павінна выціснуць беларускую». — Дужа цяжка чуць такіе словы ад беларуса ды ешчэ вучыцеля. У нас толькі старые што і гукаюць правідлова, а з маладых мала хто: ўсё і ўсадзюць у сваю мову расейскае слаўцо.

Бедна тут жывуць беларусы, зямелькі мала і гэтые гады усё няўрода, прыходзіцца атпраўляцца у далёкіе заработкі; лесу свайго ні маюць і трэба купляць ад памешчыкоў, каторые дужа дорага бяруць, а калі селянін, ні маючы грошы купіць, украдзець якую палку, то тады ён саўсім прапашчый: засудзюць беданага так, што хоць с торбай ідзі. Ня буду хваліцца. скажу толькі шчырую праўду, што мой бацька жывець с суседнімі беларусамі у згодзе, н колі ешчэ не судзіўся з імі і лес ім прадаець па самай дзяшовай цане, ну за тое і яны уважаюць яго.

Я дужа люблю дзяцей і дзеля гэтаго як толькі кончыла гімназію дык стала вучыць дзяцей. Дзеці у мяне вучацца ахвотна; усё што можна стараюся тлумачыць на іх роднай мове. чытаю ім беларускіе кніжкі і яны заўсёды ждуць не цярпліва «Нашай Нівы», ці ня будзе там такіх вершоў каб можна было ім выўчыцца на памяць Вершоў беларускіх яны знаюць многа. Школка мая радуе маю душу і без яе мне было-б цяжка і нудна.. *Марыя.*

# З усіх старон.

### Паход проці Думы.

У Думскіх кругах ходзюць чуткі, што дзеля таго што не удалося у Думе зрабіць чорнасоценную большасць, пачаліся заседаньня чорнасоценцоў дзеля арганізаціі паходу проці Думы.

### У міністэрстві дарог.

У Міністэрстві дарог пакінулі службу усе начальнікі аддзелоў і перайшлі на прыватную службу; іх заменяюць асобамі рэкамэндаванымі правымі арганізаціямі.

### Забарона.

Шмат дзе паліцыя забараняе земствам разсылаць вучыцелям рэзолюціі зьезду у справе народнай асьветы.

### Маскоўскі унівэрсытэт.

Маскоўскі унівэрсытэт сьвяткаваў гэтымі днямі 159 гадоўшчыну сваей працы Пасьля урочыстаго акту 200 студэнтоў сьпевалі песьні каля памятніка Ломаносава. Па загаду паліціі студэнты разыйшліся.

### Пачтовые чыны

У Маскве апошнімі часамі чыноўнікі тэлеграфу сходзяць з розуму і накладаюць на сябе рукі праз цяжкіе варункі. Нідаўна зарэзаўся чыноўнік Сініцын, а гэтымі днямі тое самае зрабіў стары тэлеграфіст Боброў.

### Інародчая школа.

На апошнім зьездзі цэркоўна школьных працаўнікоў асабліўую увагу звярнулі на тое, што молдавяне, каторых вучуць у пачатковых школах расейскай мовай, дужа мала маюць карысці з гэтай навукі Найгорэй адбіваецца гэна на навучаньні веры. Прыняўшы ўсё гэта пад увагу зьезд пастанавіў вучыць веры па малдавянску і пры навучаньні іншых рэчэй карыстацца роднай мовай поруч з расейскай.

### Акадэмісты.

Акадэмістамі называюць сябе чорнасоценцы студэнты. За выказываньне свайго чорнасоценства гэтые людцы бралі грошы ад Пурышкевіча. Цяпер яны перэжываюць цяжкі момэнт, бо Пурышкевіч ужо тры месяцы не прысылае ім грошы. Акадэмісты бачучы, што Пурышкевіч пакідае іх, пастанавілі прылучыцца да дубровінцоц, каторых падтрымлівае грашамі мільёнэрка—Палубоярынова, супраціўніца Пурышкевіча. Калі пачуў гэта Пурышкевіч дужа устрывожыўся і па тэлеграфу прасіў акадэмістоў каб не рабілі гэтаго бо ён ужо і грошы сабраў для іх.

### 10,000 рэвольвэроў.

С крамы, Зороховіча у Чарнігове украдзена 10 000 рэвольвэроў і патроны да іх. Хто украў невядома. Цэнных, сярэбраных і др. рэчэй злодзеі не бралі.

### Папраўка.

У шарадзе ў 3 нумэры «Н. Н.» укралася памылка. У трэцім радку 3-го чатырохверша, лічучы з гары, надрукована: І *другога* побач з ім, — а трэба каб было: І *трэцяго* побач з ім.

Рэдактар выдавец
А. Ўласоў.


ЛЕПШЫ СЯБР ЖЫВАТА
ВІНО СЭН-РАФАЭЛЬ



Праўдзівае толькі з гэтым кляймом





200,000 р. 75,000 р. 40,000, 25,000 р. і т. д.

Праўдзівые Гасударственные **Выгрышные Білеты**

2-ай пазычкі на 1 марца 1914 году з укладам

**7 руб. 50 кап.**

прадае Банкірскі дом **М. С. Матусовскій Кіеў** Александроўская вуліца 34.

Асобы даўшые задатку 7 р. 50 кап. атрымліваюць адну двадцатую часць выйгранаго якое можэ пасьці 1 марца 1914 году на двадцаць пяць выгрышных 1-й пазычкі, нумэры каторых акуратна азначэны у квітанціі, высыланнай зара па атрыманьню грошы.

На выпадак ціражу, безплатна абменіваем на квітанцію у 25 білетоў чароднай пазычкі г. зн. 1 марца 1914.

**1 марца 1914 году**

**выігрываюць усяго 300 білетоў 600.000 руб. Выйгрышы адбываюцца ў С.Пецярбурскай Канторы Гасударственнаго Банка**

і табліцы друкуюцца ва усіх газэтах.

Увага: Пры высылцы грошы просім: паказаць Ваш акуратны адрэс для заказных пісем.

Спісак асоб, каторые выйгралі па нашых квітанціях вялікіе суммы у Студні, Марцу і Маю 1913 г. і ў Студні 1914 г., высылаюцца, на жаданьне безплатна.

2 квітанціі на учасьце ў 50 білет. 15 р.

3 квіт. на учасьце ў 75 біл. 22 р. 50 к.

Квітанція высылаецца також і наложэнай платай, па аттрыманьню задатку па 3 руб. на кожную квітанцію.



**У маёнтку Вялікіе Граничы**

**Вілейскаго пав. Віленскай губ.**

Дзедзіча Свіды, прадаюцца 400 дзесяцін зямлі, парэзаные на хутарскіе вучасткі рознай меры, у кожным ёсць сенажаць і лясочэк. 7 вёрст ад ст Уша Л. Р. ж. д. Аб варунках можна даведацца па адрэсу: *Горад Радашковічы, Віленскай губ., м. Вялікіе Граничы, Стэфану Свіда.*

# Т-ва „ПРАВАДНІК“

Вялікая вуліца д. № 96. Гр. Тышкевіча. Тэлефон № 10—13.
„ „ д. № 42, А. Г. Сыркіна. „ № 18—08.

Галешы—гумілястыкавые боты для коннай язды, палеваньня і рыбкоў.

Ліналеум.

Шыны.

Брэзэнты—плашчы.

Прэдстаунцітво т-ва НАРВСКАЙ льняна-прэд. мануф.

# Т-ва „ПРАВАДНІК“

Валікая вуліца д. № 96. Гр. Тышкевіча. Тэлефон № 10—13.
„ „ д. № 42, А. Г. Сыркіна. „ № 18—08.

Рукавы спіральные і выкідаючые для усіх патрэб.

Набіўка пласціна,

Картон азбэтавы

Пластына Маноніт, ігнізыт, піроніт, бароміт.

КЛАПАНЫ ДІАФРАГМЫ.

Ізоляцыйные прылады для электрычэскіх установак.

# Т-ва „ПРАВАДНІК“

Валікая вуліца д. № 96, Гр. Тышкевіча. Тэлефон № 10—13.
„ д. № 42, А. Г. Сыркіна „ № 18—08.

Гумілястыка для выціраньня высшага гатунку.

Мядзьведзі Шышкіна, Напольен і др.

Сцірацін для чарніл і алоуца.

Гімнастычные прыборы.

Грэбяні свайго штукарнага выробу — лепшые зі усе заграніўчые сарты.

Хірургічные і гігіенічные прыпілежнасьці для дам і мужчын.

Кольцы для ключоу.

Коркі гэрматычные.




Толькі **БЕЛАРУСАМ** селянам

прадаюцца вучасткі зямлі у іменьні Гай, каля самаго гораду Пінска. Задатак па 20 руб. ад дзесяціны, разсрочка платы на колькі гадоў па 6%. Асабліва важна для гароднікоў, рэмесьнікоў, фабрычных работнікоў і скатаводоў.

**Э. Зузекіль, ім. Гай, каля гор. Пінска Мінск губ.).**

## Пахвінные бандажы.

Важна для хворых кілой. Раблю спэціальные бандажы для кожнаго хвораго кілай, каб немучыўся ад гэтаго болей, я вырабляю цяпер без спружын г. зн. гумілястыкавые, зробленые па навейшай сыстэме інжэнера—Ортопэда „А. Клаверы“ с парыжа. Я раблю розные сарты дамскіх бандажоў, набрушнікі, почэчные бандажы а такжэ бандажы розных сартоў для дзяцей.

**Заказы выпаўняюцца скора і акуратна Адрэс: бандажна — ортопэдычная майстэрня І. Хіліесбэрга, Вільня, Благавешчэнская вул. д. № 14. Фірма бытуе ад 1890 г.**



ВЕРНЫ СЯБР ДЗЯЦЕЙ

# БІОМАЛЬЦ

Хім. уст. Бр. Патэрман Тэльтов Бэрлін ўплывае на дзіцячы арганізм лепей за рыбій тук (тран) і розные штучные прэпараты. Ен прыяцен смакам, узмацовывае арганізм, корміць нэрвовую сыстэму, устанаўлівае правільные траўленьне, узмацняюча ўплывае на косьці і глаўнае—павышае спажыўнасць.

Выйшоу з друку № 1.

# „ЛУЧЫНКА“

**Літэратурна-навуковы месячнік беларускай моладзі.**

Адрэс рэдакцыі: Мінск. Александроўская 25.

Падпісная цэна на год 2 р. на 6 мес. 1 руб. на 3 м. 50 к.

3-ці год выдавецтва

# „САХА“

**Першы сельска-гаспадарскі беларускі месячнік.**

Адрэс рэдакцыі: Мінск. Александроўская 25.

Падпісная цэна на 1 год 1 руб. 20 кап., на 6 мес. 60 кап.

Саха і Лучынка разам 3 руб. на год. Выйшоў № 19 „Сахі“.

Будую усякіе

Незгараючые будоулі

Адрэс: Беларуская кнігарня для А. С.


Друкарня Мырціна Кухты, Татарская 20.